**Палулех, З.** І сняцца сны пра Афганістан / З. Палулех // Браслаўская звязда. — 2001. — 9 мая. — С. 1—2.

# І СНЯЦЦА СНЫ ПРА АФГАНІСТАН

Ужо не адно пакаленне людзей не чула грукату вайны, не прайшло праз яе выпрабаванні і пакуты. Ім пашчасціла нарадзіцца і вырасці ў мірны час. Аднак тыя юнакі, якія служылі ў Афганістане, выконвалі там свой інтэрнацыянальны абавязак, выпрабаваны яе агнём. Цяпер іх называюць воінамі-інтэрнацыяналістамі. Яны, маладыя зусім хлопцы, чулі, як свішчуць кулі, удзельнічалі ў сур'ёзных баявых аперацыях, пасапраўднаму змагаліся з ворагам. Вайну яны бачылі ўвачавідкі, а не былі яе староннімі назіральнікамі. Сярод многіх тых, каму давялося служыць "там", і Віктар Міхневіч з Муражаў.

…Звычайны вясковы хлопец, ён з дзяцінства марыў працаваць з тэхнікай. Таму пасля заканчэння школы, ніколькі не вагаючыся, пайшоў вучыцца ў Відзаўскае ПТВ. Атрымаў там правы шафёра, трактарыста і ўладкаваўся адразу на працу ў калгас «Дружба». Калі прыйшоў час прызывацца на тэрміновую ваенную службу, прызнаўся: марыў аб адным, каб трапіць у рэгіён, дзе заўсёды цёпла, бо з маленства не ўспрымаў і не любіў холаду.

Ужо ў поездзе, па дарозе ў вучэбку ў Ашхабад, салдаты высветлілі, што вязуць іх рыхтавацца да службы ў Афганістане. Так яно і сталася. Праз паўгода Віктар трапіў менавіта ў самае пекла вайны, у Джэлалабад, што непадалёку ад граніцы з Пакістанам. Нялёгка было адразу адаптавацца да 50-градуснай спякоты, амаль пастаяннай страляніны, ды, як кажуць, і перастроіць характер на ваенны лад. Але, як лічыць Віктар, чалавек прывыкае да ўсяго.

Ужо літаральна праз лічаныя дні пасля прыбыцця на месца дыслакацыі давялося ўдзельнічаць у баявых дзеяннях, а служыў ён дэсантнікам. Неўзабаве, прызнаўся, усё ўнутры перавярнулася, калі пасля завяршэння аперацыі не далічыліся адразу пятнаццаці чалавек. І прыйшло разумение, што калі не будзеш страляць ты, то заб'юць цябе.

Віктар не любіць расказваць пра Афганістан. Ен, па натуры чалавек жыццярадасны, энергічны, баявы, умомант становіцца немнагаслоўным і задумлівым.

Афганістан раскалоў яго жыццё на дзве палавіны – да і пасля вайны. Юнак спаўна прайшоў яе школу, школу загартоўкі, мужнасці. Часта ўспамінае сяброў. Там паміж імі вельмі моцна былі развіты пачуцці таварыскасці, узаемадапамогі, узаемаразумення. Там было нейкае асаблівае братэрства, і з любым можна было сапраўды ісці хоць у ваду і агонь.

Віктару пашчасціла, ды, як лічыць, і Бог дапамог, што застаўся цэлым і жывым. Аднак да гэтай пары, вось ужо амаль праз 16 гадоў пасля дэмабілізацыі, не загойваюцца душэўныя і смутныя сны пра Афганістан.

Ёе быў камандзірам аддзялення, і, выдома ж, нес адказнасць не толькі за сябе, але і за сваіх саслужыўцаў. І неаднойчы, калі ўдавалася выйсці з бою без страт і ахвяр, адчуваў сапраўднае задавальненне. Было так і пасля бою ў Баграме. Менавіта за гэта Віктар Міхневіч быў прадстаўлены да высокай урадавай узнагароды – ордэна Чырвонай Зоркі. Праўда так, да гэтай пары яго і не атрымаў. Але нядаўна ў райваенкамат прыйшла радасная вестка ад савета афганцаў з Мінска, што атрымае яго ў хуткім часе. Узнагарода, як кажуць, усе ж знайшла свайго героя. Мае

Віктар і медаль «За адвагу». На мае пытанне, за што атрымаў яго, адказаў каротка: «За тое, што быў «там і ваяваў…»

Дамоў вяртаўся ў лістападзе 1985 года. Слязамі радасці ад сустрэчы з узмужнелым, дарослым сынам напоўніліся ў адно імгненне вочы маці.

Без работы доўга не вытрымаў. Праз паўмесяца, а дазвалялася адпачываць тры, паўшоў працаваць у калгас, спачатку шаферам, затым перасеў на трактар. І з той пары не здрадзіў выбранай прафесіі. І шчыра прызнацца, у яго вачах я бачыла непадробнае захапленне работай. Прама кажучы, сення рэдка даводзіцца сустракаць такіх шчырых, апантаных людзей і работнікаў.

У сям´і Віктара і Алены Міхневічаў растуць двое дзетак – дачка Яўгенія і сын Сяргей. Бацька ўпэўнены, што падрастае дастойная падмога і змена. Я заўседы з вялікай павагай адношуся да тых юнакоў, якім давялося несці воінскую службу ў Афганістане. Гляджу на іх, як на лепшую частку нашай моладзі, якая пазнала сапраўдныя каштоўнасці на мяжы паміж жыццем і смерцю. Ім давялося прайсці праз шматлікія ваенныя выпрабаванні, як і нашым бацькам і дзядам, у іх нярэдка надломлена псіхіка, яны вастрэй за нас успрымаюць людское раўнадушша, несправядлівасць, але самае галоўнае, што іх душы і сэрцы не ачарсцвелі на той вайне і яны спаўна аддаюцца жыццю, а сваю любоў дораць жонкам, дзецям, сваім родным і блізкім.

**З. Палулех**